


Залеская талака

Інфармацыйны бюлетэнь Залескага сацыяльна-дзелавога цэнтра /№5/ лістапад 2011

Открытие уголка по устойчивому развитию в сельской библиотеке




Уголок по устойчивому развитию в сельской библиотеке



Тренинг по изучению вопросов ландшафтного дизайна в сельском совете


26 октября в библиотеке деревни Залесье появились книги по устойчивому развитию, которые разместились на новых демонстрационных стеллажах. Некоторые из публикаций изданы при участии экспертов фонда «Живое партнерство», а также переданы Библиотекой по устойчивому развитию РНТБ. Посетители библиотеки смогут познакомиться с материалами о принципах устойчивого развития, с деятельностью инициатив по МП-21, материалами по обращению с отходами, другими вопросами экологии энергосбережения.



Один из объектов для благоустройства

Уголок по устойчивому развитию создается в рамках проекта Программы малых грантов Посольства США «Создание сельского социально - делового центра в д. Залесье». Первыми посетителями, которые ознакомились с публикациями, стали женщины ОО «Сельчанка», собравшиеся в сельском совете на тренинг по изучению вопросов ландшафтного дизайна и формированию навыков составления ландшафтных проектов, которые планируют реализовать на практике также в рамках данного проекта с широким участием местных жителей.

Женщины обсуждали идеи по созданию детской площадки на ул. Пионерской в д. Залесье, благоустройству дворовой территории домов по ул. Советской, а также территории, прилегающей к зданию сельского совета, в котором расположен Сельский социально - деловой центр и офис ОО «Сельчанка» Сморгонского р-на. Программа Матра Посольства Нидерландов в рамках своего проекта оказывает экспертную помощь в



Татьяна Кежун и ландшафтный архитектор Наталья Манаенкова

подготовке дизайн - проектов, организует семинары и обеспечивает участие ландшафтного архитектора Манаенковой Натальи Александровны. Она на протяжении нескольких встреч будет помогать местным жителям грамотно подготовить дизайн - проекты по благоустройству площадок для презентации их общественности.

Галина Матюшенко, директор проекта «Создание сельского социально-делового центра в д. Залесье»

Парадак на зямлі

Старшыня Залескага с/с Зянон Грышкевіч паведаміў, што ў лістападзе Залескім сельскім Саветам запланавана правесці шэраг мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні тэрыторыі:
- абслугоўванне ліній вулічнага асвятлення;
- навядзенне парадку на могілках, у прыватнасці, агароджы могілак у вёсцы Міхневічы;
- падбуртоўка пляцоўкі часовага складзіравання на мініпалігонах каля вёскі Зарудзічы

"Сяльчанка" ў сваю чаргу таксама плануе займацца добраўпарадкаваннем тэрыторый побач з сельскім Саветам (тут размяшчаюцца Залескі сацыяльна-дзелавы цэнтр і офіс ГА "Сяльчанка" Смаргонскага раёна) і домам па вуліцы Савецкай 10а.Трэба давадзіць да ладу і тэрыторыю будучай дзіцячай пляцоўкі па вуліцы Піянерскай. Просьба да мясцовых жыхароў далучацца, бо гэта патрэбна і вам, і вашым дзецям!

Рэдакцыя "Залескай талакі"

АБ'ЯВЫ

17 лістапада ў 10-00 у зале паседжанняў сельскага Савета адбудзецца семінар-трэнінг "Павышэнне дзелавой і сацыяльнай актыўнасці вясковых жыхароў у сферы развіцця агра- і экатурызму ў Смаргонскім раёне". У семінары прыме ўдзел старшыня ўпраўлення БГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыя Клецунова. Запрашаем паўдзельнічаць усіх, хто цікавіцца вясковым турызмам!

Аргкамітэт

У суботу 26 лістапада адбудзецца добраўпарадкаванне могілак у Залессі. Просьба да мясцовых жыхароў прыняць удзел у важнай справе!

Сельскі Савет

Пейзажы Вольгі Пачыкоўскай



Кожны чалавек – цэлы свет, свет цікавы і непаўторны. Здорава, што і ў нашым Залессі ёсць людзі, якія не абмяжоўваюць сваё жыццё толькі домам і працай ды паспяваюць заўважыць прыгажосць навакольных краявідаў. Хочацца прапанаваць чытачам "Залескай талакі" гутарку з Вольгай Пачыкоўскай, бібліятэкарам, гаспадыняй, мастачкай і проста прыгожай маладой жанчынай.

Д. Л. Як даўно ты зацікавілася мастацтвам, пачала пісаць карціны?

В. П. Маляваць я люблю з дзяцінства, а сур'ёзна пачала займацца гэтым пазней… Аднойчы у кніжцы вершаў Някрасава, якую муж набыў для сына Віці, я ўбачыла прыгожы пейзаж – і адразу ж "загарэлася" ды скапіравала алоўкам адну ілюстрацыю: атрымалася такая чорна-белая графіка, якую потым я расфарбала гуашшу. Гэты невялікі малюнак фармату А4 – мая першая сур'ёзная работа.

Зусім простая карціна, з якой пачалася мая творчасць… Тады раптам падумалася, што хачу паспрабаваць пісаць карціны. Спачатку спрабавала гуашшу, потым – алейнымі фарбамі. Навучылася грунтаваць паверхню палатна, правільна раствараць алейныя фарбы…І ўжо адзінаццаць год пішу карціны алеем.

Д. Л. Дзе звычайна набываеш фарбы?

В. П. Зазвычай у краме "Галерэя" ў Мінску.Тут прадаюцца карціны і ўсе прылады для малявання. Цяпер можна практычна ўсё набыць і ў краме "Багет" у Маладзечна.

Д. Л. Калі лепей малюецца, у які час дня?

В. П. Малюю вечарам, калі дома ўсе пачынаюць засынаць…

Д. Л. І хапае святла?

В. П. Хапае: уключаю звычайную настольную лямпу і лямпы дзённага святла, патрэбен і белы, і жоўты свет. Год дзесяць таму я магла маляваць усю ноч, а цяпер максімум да гадзіны ночы. Заўтра ж на працу. Раней я забывалася пра час, калі малявала.

Д. Л. Дзе знаходзіш ідэі для карцін?

В. П. Шукаю цікавыя фотаздымкі ў інтэрнэце, ілюстрацыі ў часопісах… Звычайна я капірую, пісаць з натуры яшчэ не спрабавала: для гэтага патрэбен і вольны час, і добры эцюднік. Канечне, было б цікава паспрабаваць пісаць пейзаж з натуры… Збольшага, люблю менавіта пейзажы, асабліва зімовыя, мне блізк стыль рэалізму.

Д. Л. Ці ўдзельнічала ты ў якіх-небудзь творчых конкурсах са сваімі работамі?

В. П. Гэтай восенню ў Нацыянальнай бібліятэцы праводзіўся рэспубліканскі конкурс "Сам сабе мастак", прысвечаны захапленням людзей, якія працуюць у бібліятэках Беларусі. Я пасылала для ўдзелу ў конкурсе фотаздымкі шасці сваіх карцін, а выбрыны былі дзве – "Зімовы вечар" і "Рання вясна". І дыплом 3 ступені атрымала менавіта "Рання вясна", адна з маіх першых карцін.

Д. Л. Што для цябе – мастацтва і твае карціны?

В. П. Хобі і цікавы занятак, тое, што робіць жыццё больш яркім. У самым пачатку я заплюшчвала вочы, каб заснуць, – і бачыла фарбы, пэндзлі, карціны.

Дар'я Ліс

20 лістапада - Дзень працаўніка сельскай гаспадаркі і перапрацоўваючай прамысловасці

Администрация, профком ОАО «Сморгоньлён» поздравляет всех своих сотрудников и ветеранов с Днём работника сельского хозяйства и перерабатывающей промышленности!

В преддверии праздника особенно хочется отметить работников, проживающих в Залесье и близлежащих деревнях. Наш директор Дмитрий Дмитриевич Казакевич родом из деревни Зарудичи, работает руководителем с февраля 2011 года. За 2011 год мы получили хороший урожай зерновых (42,18 ц/га), валовый сбор составил 5484,7 т. Лучшие люди предприятия работают и живут на участке «Залесье»: В.З. Мойсевич, А.Я. Мисун, Л.В. Никитин, С.В. Грибович, Л.К. Шпакович.

Комбайнер Мойсевич Виктор Зенонович работал без помощника и занял первое место на уборке зерновых (1310 т, комбайн (КЗС-12). Аноп Сергей Иванович с помощником Ковязо Сергеем Валерьевичем заняли второе место (1142 т, комбайн КЗС-12).

Мисун Александр Яковлевич – лидер по отвозу зерна от комбайнов (1575 т, МАЗ-555142). Шпакович Леонид Константинович перевез 1337 т зерна и занял 2 место. Работая в хозяйстве во время уборки, экипаж Рудого Виктора Анатольевича и Гродицкого Алексея Томашевича намолотил 565 т зерна на комбайне КЗС-10. Грибович Сергей Владимирович и Бровко Дмитрий Викторович на комбайне Лида-1300 намолотили 450 т зерна.

Ветеран труда Южик Елена Петровна постоянно показывает хорошие результаты. Она работает оператором по доращиванию крупного рогатого скота с самого открытия животноводческого комплекса. Елена Петровна выращивает телочек, среднесуточный привес за 10 месяцев 888 г + 164 г к 2010 году, получила всего 23469 кг привеса крупного рогатого скота.

Молочно-товарная ферма «Зарудичи» (заведующая З. Ф. Емельянова, зоотехник Е. А. Забогонская) показала хорошие результаты: здесь надоили за 10 месяцев 488, 9 т молока (по 3037 кг одной коровы). Лучшими оказались доярки О.С. Шоть (3109 кг), М.Ю. Герман (3060 кг), В.В. Рудая (3046 кг).

Ответственно относится к своей работе заведующая участком Ирина Владимировна Волынец. Здесь была самая высокая урожайность в хозяйстве (45, 5 т). Сельскую династию продолжил Денис Вячеславович Волынец, заведующий ремонтными мастерскими (в хозяйстве много лет работали его дедушки и бабушки). Недавно Денис женился, желаем молодой семье счастья и удачи!

Анна Шемет,
председатель профкома ОАО «Сморгоньлён»

Заснавальнік ГА "Сяльчанка" /адрас: в. Залессе, вул. Чыгуначная. Галоўны рэдактар Дар'я Ліс, тэл. для сувязі +375 29 655 30 13
250 асобнікаў, распаўсюджваецца бясплатна "Пры падтрымцы Праграмы Малых Грантаў амбасады ЗША ў Рэспубліцы Беларусь".